# ЛІСТ ДА БЛІЗКАГА ЧАЛАВЕКА

**(прамы зварот кандыдата Высоцкага да сваіх суседзяў)**

*Я люблю Вас!*

*У гэтых словах няма двулічнасці. Мае дарагія суседзі, я не магу ставіцца без хрысціянскай чалавечай любові і сімпатыі да людзей. Тым больш да людзей, якія паверылі ў мяне, як чалавека і палітыка, ды аддалі за мяне свае галасы на выбарах 1995 г.*

*Хіба я магу лічыць Вас чужымі сабе?! Толькі падманам у нас скралі нашую агульную перамогу.*

*Сябры, часта прыходзіцца чуць крытыку за бескампраміснасць Высоцкага. Але ці мае права Высоцкі быць мяккацелым, калі адстойвае народныя, а значыць — канкрэтна Вашыя інтарэсы, калі ліхадзеі фальсіфікуюць вынікі галасавання?!*

***У нас ужо былі мяккія палітыкі, што ўмеюць прыгожа гаварыць. Яны прайгралі ўсё. Дзякуючы іхняй бязвольнасці да ўлады прыйшлі нахрапістыя невучы. Сёння мала быць разумным і гаваркім. Неабходна яшчэ мець палітычную смеласць і волю.***

*Хачу асабіста звярнуцца да людзей сярэдняга і сталага ўзросту. Многія з Вас трошкі вагаюцца, ці аддаваць галасы Высоцкаму. Мне яшчэ няма трыццаці гадоў. Мяркую, гэта і слабы, і моцны мой бок, як кандыдата. Але можа быць, стадыя максімальнай працаздольнасці не горш, чым стадыя вялікага аўтарытэту. Канешне, каб аддаць голас маладому кандыдату, неабходны не толькі розум, але і пэўная мужнасць...*

*Людская галеча і прыніжанасць не даюць нам права яшчэ на 10 год «раскачкі».* ***Беларусь ратаваць патрэбна сёння!***

*Няхай Вашая незадаволенасць і крыўда да ўлады, што дурыць і абкрадае Вас, выльецца у падтрымку праціўніка пануючага рэжыму.*

*Вы ведаеце нашую праграму. Я не збіраюся з'язжаць за мяжу, я застаюся з Вамі. Будзем разам падымаць нашую родную Беларусь.*

***Але пачаць рабіць азначанае можна толькі пасля вырашэння галоўнага пытання — ПЫТАННЯ АБ УЛАДЗЕ! Таму я звяртаюся да Вас за дапамогай і падтрымкай.*** *Нельга дапусціць каб фальсіфікатары зноў вырашылі за народ ягоны лёс. У мяне досыць сілаў і ведаў каб дапамагчы свайму народу, нашай Беларусі!*

***Але перамагчы мы зможам толькі разам!***

*Вы заўсёды зможаце звязацца са мной па тэлефоне 261-38-37.*

*З павагай, Ваш С. Высоцкі*

Modern History Archives
Archív Najnovšie Historyi
6 96

vytoki.net

Находился в прокуратуре
Советского района с 9.30 до
10.3[illegible]

# ПОВЕСТКА

Вы вызываетесь для допроса в качестве свидетеля к следователю прокуратуры Советского р-на юр. советник

(наименование прокуратуры, классный чин,

Тишкович на 9.30 часов «03» июня 1996 г.

фамилия)

по адресу: ул. Я. Коласа, 1

каб 12

Следователь ____________

(классный чин и подпись)

Последствия неявки — При неявке свидетеля по вызову без уважительной причины свидетель на основании части 2 ст. 67 УПК РБ может быть подвергнут приводу.

Возвращается следователю

Кому Высоцкому Сергею

(фамилия, имя и отчество свидетеля)

Ивановичу

Расписка в получении повестки на имя ____________

(фамилия, имя и отчество

За тры дні агітацыйных пікетаў С.Высоцкага давераныя асобы кандыдата былі затрыманыя міліцыяй Савецкага РАУС двойчы. Як патлумачылі, ёсць загад адміністрацыі раёна. Зроблена гэта было нахабна, былі абражаныя дзесяткі выбаршчыкаў, якія назіралі сцэну затрымання.

Чаго ўлада так баіцца? Чаму на кандыдата Высоцкага ідзе сапраўдная траўля?

Вышэй вы бачыце павестку у пракуратуру кандыдату Высоцкаму. Напэўна на хвіліну ў душы нешта ўздрыганула?.. “А раптам мне?”, “А раптам за мной?”

Сення яны змагаюцца з Высоцкім. Што будзе з намі заўтра, калі, ня дай Божа, яны перамогуць?

Калі яны перамогуць такіх, як Высоцкі — заўтра ўжо не будзе нікога, хто ўзніме голас за нас.

## *ГОЛАС ВЫСОЦКАМУ — ГОЛАС АЙЧЫНЕ!*

***Выбаршчыкі з групы падтрымкі С. Высоцкага.***

vytoki.net